Источник: “Рэспубліка” – 2021-10-22

# Сонечная ягада

«Альфа», «агат дансکі», «алёшанька», «космас», «мінскі ружовы»… У Беларусі вывучэннем і вывядзеннем новых гатункаў вінаграду займаецца РУП «Інстытут пладаводства». У яго калекцыі налічваецца за паўтысячы гатункаў, каля двух дзясяткаў з якіх адаптаваны пад кліматычныя асаблівасці нашай краіны. Але аматары-вінаградары кажуць, што расце ў нас значна больш вінаграду — ажно да тысячы гатункаў! Каторы год у Пінску праводзіцца рэспубліканская выстава-кірмаш «Янтарная гронка вінаграду», на якой дэманструюць свае рэкорды прадстаўнікі розных рэгіёнаў краіны. Не стала выключэнем і сёлетняя восень.

— Калі ў 2012 годзе мы ўпершыню правялі выставу-кірмаш, людзі пыталіся, адкуль прыехалі. З Малдовы ці Грузіі? А мы з Пінска, з раёна, з Бярозы, Іванава, Століна, Ліды… — смяецца кіраўнік пінскага клуба «Вінаград Палесся» Васіль Дэйнэка.

Сёлета на пінскі кірмаш з’явіліся каля 30 удзельнікаў. На жаль, шмат хто адмовіўся, бо надвор’е сапсавала перспектывы на некаторых вінаградных плантацыях: калі летам пайшлі дажджы, ягада патрэскалася, а такую не пакажаш і не прадасі.

І ўсё ж было чым пахваліцца. На стэндах вінаградары развесілі прыгожыя і смачныя гронкі з ягадамі розных форм і колераў — ад ружовага да цёмна-зялёнага, ад цёмна-чырвонага да фіялетавага.

Цікавасць да выставы ў пінчукоў была велізарная: адны стаялі ў чэргах, гатовыя плаціць па дзесяць рублёў за кілаграм салодкай ягады, другія куплялі саджанцы, трэція прыйшлі, каб атрымаць кансультацыю ад больш вопытных.

Пінск нездарма лічыцца сталіцай беларускага вінаградарства. Па-першае, тут цёпла. Па-другое, тут здаўна ёсць прамысловы вінаграднік, які належыць Пінскаму вінаробнаму заводу (чулі пра беларускі каньяк, які нядаўна прэзентавалі Прэзідэнту? Ён з Пінска!).

Спачатку для многіх пінчукоў вінаградарства стала сямейнай справай. А потым і суседзі прыклад узялі. Як Мікалай Амяльчук з вёскі Хорск Столінскага раёна. Гандаль на выставе-кірмашы ў яго ішоў бойка — і ягадай, і саджанцамі. Дапамагалі дачка Крысціна з мужам Валерыем.

— Справа жыцця, — смяялася Крысціна, толькі і паспяваючы ад аднаго пакупніка да другога.

Мікалай Сацута з вёскі Гарбаха Іванаўскага раёна тлумачыў нам, што вінаград — гэта хвароба, ад якой няма лекаў:

— Мы з жонкай Аленай займаемся вінаградарствам з 2014 года. У нас 160 гатункаў, 360 кустоў растуць на 40 сотках зямлі. Узялі прыклад са знаёмага ды так уцягнуліся, што не ўяўляем, як без вінаграду раней жылі.

Найбольш Мікалаю падабаец-ца гатунак «есаул» — смачны, не хварэе і не баіцца прыродных катаклізмаў.

А вось Іван Пазняк з вёскі Жычын Бярозаўскага раёна раіць тым, хто думае заняцца вінаградарствам, пачынаць з гатунка «алёшанька»:

— Ён выведзены гадоў 50 таму, і селекцыянеру варта паставіць помнік. Некаторыя гэты гатунак выкідваюць, гонячыся за лазой з больш буйной ягадай, і дарма. «Алёшанька» — ураджайны і марозаўстойлівы. «Агат дансکі», дарэчы, таксама.

Перш чым абзавесціся вінаграднікам на ўчастку, дасведчаны вінаградар Ігар Роўкач з Давыд-Гарадка раіць з’ездзіць на спецыялізаваную выставу альбо наведаць вінаграднікі Інстытута пладаводства.

— Перш чым саджаць лазу, трэба пакаштаваць плады і пераканацца, што такі гатунак будзе запатрабаваны ў пакупнікоў, — раіць вінаградар.

Сам Ігар Роўкач саджанцы не купляе, ён прывівае на загадзя выса-джаную лазу тыя гатункі, якія яму падабаюцца. Яго любімыя — «прыма ўкраіны» і кіш-міш «юпітэр». Вінаград, вырашчаны на ўчастку Ігара Уладзіміравіча, не раз перамагаў у намінацыях конкурсу «Янтарная гронка вінаграду».

Гэтым разам на выставе-кірмашы ў Пінску самай вялікай стала гронка ягад гатунку «ланселот» з вінаградніка Аляксандра Бісултанава з Пінска — яе вага 2 кілаграмы 358 грамаў!

Самую буйную ягаду вагой 27,06 грама гатунку «віктар» прывёз лідчанін Юрый Стражаў. Ён жа перамог у намінацыі «Самая прыгожая гронка». У намінацыі «Самая смачная ягада» перамогу атрымаў вінаград з Гомеля Аляксандра Дубоўскага.
А лепшую экспазіцыю сярод сталовых гатункаў вінаграду падрыхтаваў пінчук Генадзь Ляўшук.